■ Шляхамі пісьменніка

У ГОСЦІ ДА БЫКАВА

Заўтра, у 90-ы дзень нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава, свае дзверы для наведвальнікаў расчыніць філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры — «Музей-дача Васіля Быкава». Ён размяшчаецца ў пасёлку Ждановічы-6 па адрасе: вуліца Вінаградная, 62.

Двухпавярховы дом агульнай плошчай 104 кв. м пісьменнік пабудаваў у 1984 годзе. Менавіта тут ён мог адпачываць ад гарадской мітусні, прымаць блізкіх сяброў, маляваць, займацца аўтамабілем у гаражы. Два гады таму ўдава Васіля Быкава Ірына Міхайлаўна перадала дачу ва ўласнасць дзяржавы. Было прынята рашэнне адкрыць тут музей.

Васіль БЫКАЎ на дачы ў Ждановічах. Фота прадастаўлена Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры.

— Гэты музей, як кажуць спецыялісты, максімальна мемарыяльны, — распавядае дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Лідзія Макарэвіч. — Мы захавалі ўсе прадметы, што былі ў доме пры жыцці Васіля Уладзіміравіча: ад мэблі да сувеніраў, мастацкіх работ, нават прадметаў побыту. Такое рашэнне падказалі нам музейшчыкі з Латвіі. Падчас адной з сустрэч яны распавядалі пра свае мемарыяльныя музеі і радаваліся, што іх папярэднікі пакінулі прастору максімальна нязменнай. Мы ж стараемся не дзеля ўдзячнасці з боку будучых калег, але для захавання памяці пра Васіля Быкава. А паколькі мы назвалі гэты дом «музеем-дачай», то дадалі ў экспазіцыю яшчэ некаторыя матэрыялы. Яны паказваюць Васіля Быкава як чалавека, які вельмі любіў маляваць, а замест дзённікавых запісаў рабіў дзённікі-малюнкі.

Быкаўскія карцінкі, накіды, зробленыя алоўкам у шматлікіх блакнотах, толькі крыху павялічаныя, аж да кастрычніка будуць экспанавацца ў музеі-дачы. Тут прадстаўлена тэматычная падборка работ, прысвечаных гэтаму асабліваму дому ў Ждановічах. У экспазіцыі змешчаны і многія малюнкі, звязаныя з аўтамабілем, а таксама работы, выкананыя алеем.

У музейную прастору ператварыўся і гараж пісьменніка. Цяпер тут можна пабачыць своеасаблівую карту дарог, дзе пазначаны асноўныя кропкі, дзе бываў Васіль Уладзіміравіч: яго родныя Бычкі, Гродна, Мінск, востраў Сахалін, дзе служыў пісьменнік, ЗША, куды ён прыязджаў падчас камандзіровак, Фінляндыя.

Сёлета «Музей-дача Васіля Быкава» будзе працаваць толькі да кастрычніка. Але наступнай вясной, калі пачнецца новы дачны сезон, дом Васіля Уладзіміравіча зноў запросіць у госці. Паводле задумкі, наведвальнікі пабачаць ужо крыху змененую экспазіцыю, што прыадкрые іншыя старонкі біяграфіі і творчасці Васіля Быкава.

Марына ВЕСЯЛУХА.

«ШКАДА БЫЛО ПАКІДАЦЬ ГОРАДНЮ, ЯКАЯ СТАЛА ДЛЯ МЯНЕ РОДНАЙ…»

Невялічкія фрагменты з жыцця Васіля Быкава ў горадзе над Нёманам ва ўспамінах гродзенцаў

У Гродне пакуль няма мемарыяльных шыльдаў на будынках, звязаных з Васілём Быкавым. І адпаведнага турыстычнага маршруту няма. Але зацікаўленым ужо цяпер можна «дакрануцца» да некаторых аб'ектаў. Хаця часта і не ў тым выглядзе, як пры жыцці Быкава.

1947 год. «Якраз на дзень Перамогі цягнікам цераз Баранавічы паехаў у Горадна,— горад, дзе ў мяне не было ніводнай знаёмай душы. І які гэтак грунтоўна прычыніўся да майго чалавечага лёсу… Першую гарадзенскую ноч правёў на вакзале» («Доўгая дарога дадому»). Сёння таго гістарычнага будынка ўжо няма, а ў новым, на яго месцы, цяпер завяршаецца рэканструкцыя. Існуе шмат прыгарадных і ўнутрырэспубліканскіх маршрутаў. Аднак у параўнанні з быкаўскімі часамі ёсць і страты. У прыватнасці, няма цягніка з Гродна да Друскінінкая, дзе любіў бываць Васіль Уладзіміравіч. Выйшаўшы з саставу СССР, літоўцы палічылі непатрэбным адпаведны ўчастак магістралі, разабралі яго. Хаця цяпер многія прызнаюць гэта памылкай і нават ужо гучаць прапановы аднавіць разбуранае дзеля ўмацавання беларуска-літоўскіх кантактаў у турыстычнай і іншых сферах.

Паводле ўспамінаў Быкава, суседнія «… летувіскія Друскенікі… шмат гадоў былі адхланнем для гарадзенцаў, бы Вэрсаль для парыжан». Мне невядома, праўда, ці ездзіў ён туды цягнікам. А вось што машынай — дакладна. Гэта пацвярджае **Вітольд ІВАНОЎСКІ,** які тады працаваў уласным карэспандэнтам «Звязды» па Гродзенскай вобласці.

— У Друскеніках мы шпацыравалі па вуліцах, заходзілі у музей Чурлёніса, а ў крамах куплялі сасіскі, рыбу і сыр. Па дарозе дадому спыняліся каля легендарнага Райгардаса… — прыгадвае Вітольд Уладзіміравіч.

— Можа, ад вашага знаёмства з Быкавым і прозвішча лейтэнанта Іваноўскага, героя аповесці «Дажыць да світання»?

— Хто ведае? Са мной ён гэта не ўзгадняў.

Пакуль няма грунтоўнай музеефікацыі гродзенскага перыяду жыцця Быкава на дзяржаўным узроўні, але пачатак гэтаму энтузіястамі пакладзены. Ёсць матэрыялы фонду пісьменніка ў музеі Максіма Багдановіча, створанага яго першым дырэктарам Данутай Бічэль-Загнетавай, калекцыя ў музейным пакоі, якая была арганізавана Мікалаем Мельнікавым. Васілю Быкаву прысвечана і экспазіцыя ў музеі рэдакцыі «Гродзенскай праўды». Напрыклад, тут ёсць яго асабістая справа, распачатая 31 снежня 1947 года, калі Васіля Уладзіміравіча прынялі на працу карэктарам беларускамоўнага выдання газеты, кнігі з яго аўтографам, фатаграфіі, лісты і паштоўкі, аўтаручка пісьменніка, а таксама рэдакцыйная пішучая машынка, на якой друкаваліся матэрыялы Міхася Васілька, Аляксея Карпюка і Васіля Быкава.

Супрацоўнікі «Гродзенскай праўды» захавалі ў памяці і чыста чалавечыя «штрыхі» да партрэта Быкава. Вось якую «дробязь» прыгадвае **Людміла ГАБРУКОВІЧ,** якая паўстагоддзя адпрацавала карэктарам. Калі будынак рэдакцыі размяшчаўся на вуліцы Савецкай, то побач была крама тканін. І вось аднойчы ў продаж «выкінулі» дэфіцытны штапель. Жанчыны адразу ж пабеглі па адрэзы, а ў Людмілы Мікалаеўны грошай у кашальку не хапала. І тады адзін з супрацоўнікаў параіў звярнуцца да Быкава, які ў той час ужо атрымліваў літаратурныя ганарары:

— Ён нікому не адмаўляў, калі прасілі пазычыць да зарплаты. І мне не адмовіў. Доўга я потым насіла «сукенку ад Быкава».

Яшчэ адзін «быкаўскі» эпізод — з успамінаў **Таццяны ХОЦІМ,** якая таксама шмат гадоў працуе ў «Гродзенскай праўдзе» — раней сакратаром у прыёмнай, а цяпер вахцёрам. З Быкавым Таццяна Валер'еўна ніколі не размаўляла і нават спачатку… не ведала, што з ім сустракалася:

— Мне было 13 гадоў, калі ў Гродне адбылася прэм'ера фільма Ларысы Шапіцька «Узыходжанне» па аповесці Васіля Быкава «Сотнікаў». У кінатэатры бацька пасадзіў мяне побач з нейкім мужчынам і сказаў: «Вася, пасачы за ёй». Толькі потым я даведалася, хто гэта быў.

«Свой Быкаў» і ў гродзенца **Вадзіма ЖУРАЎЛЁВА,** які шмат гадоў працаваў у журналістыцы, а цяпер піша кнігі пра сваіх знакамітых землякоў. З Васілём Уладзіміравічам ён ніколі не бачыўся, хаця…

— Тады я быў студэнтам-гісторыкам. Вокны нашай аўдыторыі, увітыя дзікім вінаградам, выходзілі на вуліцу Ажэшкі. Калі хочаш, вытарэшчвай вочы на домік Ажэшкі і лаві момант, калі на яго парог падымуцца Аляксей Карпюк, Васіль Быкаў …Не ведаю, як і чаму, але мне і ў галаву не прыходзіла думка зазірнуць у штаб-кватэру гродзенскіх пісьменнікаў, хаця вершыкі керпаў… І не памятаю, каб нехта са студэнтаў усклікнуў: «Глядзіце, каля дома Ажэшкі гутараць Карпюк і Быкаў». Пра іх у нашай аўдыторыі ніколі не гаварылі, быццам і не падазравалі, што ў Гродне жывуць пісьменнікі…

Многія, пэўна, не падазраюць і цяпер. А вось Вадзім Жураўлёў за два апошнія гады столькі адкрыў для сябе… Запісаў успаміны дзясяткаў людзей, якія сустракаліся з Быкавым, знаходзіліся пад уплывам яго творчасці, прачытаў практычна ўсё ім напісанае, а таксама творы іншых аўтараў, пра якіх выказваўся Васіль Уладзіміравіч. На жаль, выдаць кнігу пра Быкава да 90-годдзя з дня яго нараджэння не атрымалася. Аднак, каб паспець да юбілею, нядаўна Вадзім Жураўлёў разаслаў па розных гродзенскіх адрасах электронную версію кнігі і будзе ўдзячны сваім землякам, якія з ёй пазнаёмяцца.

…З яшчэ адным гродзенцам, паэтам **Юркам ГОЛУБАМ** мы пабывалі каля двух дамоў, дзе Васіль Быкаў жыў з сям'ёй: на вуліцы Вялікай Траецкай (калісьці — Алега Кашавога) і Парыжскай Камуны. Побач з першым домам у той час знаходзілася рэдакцыя «Гродзенскай праўды». «Можна было адзець майку і выскачыць на працу»,— чуў Юрка Голуб ад Быкава:

— «Он отец мне по возрасту», як пісаў Еўтушэнка пра Смелякова. Я ставіўся да Васіля Уладзіміравіча, як да бацькі. І мне запомнілася, як ён пры кожным тэлефанаванні гаварыў: «Юра, гэта Быкаў».

Юрый Уладзіміравіч прыгадвае такі эпізод:

— Неяк, у рэдакцыі «Гродзенскай праўды», заходзіць у кабінет Быкаў, адчыняе сакваяж, а адтуль вывальваецца… хамяк. Руды такі, прыгожы.

— «Фокус» быў з яго боку?

— Не. Проста, відаць, гэта быў яго ўлюбёнец.

— Дык што, і хадзіў з ім па горадзе?

— Ды ў тым і справа.

Быкаў запомніўся Голубу і як… фатограф:

— Неяк заходжу да яго і кажу: «Васіль Уладзіміравіч, адкуль у вас узяліся такія здымкі?» (Твардоўскі, Мележ, Цендракоў, Брыль, Карпюк, само сабой…) Паўза, а потым адказ: «Гэта я сам зрабіў». Не ведаю, дзе цяпер тыя картачкі.

У 1987 годзе Юрка Голуб разам з Быкавым пабываў у Калінінградзе. На здымку, які сёння друкуецца ўпершыню,— сустрэча з маракамі:

— Памятаю таксама сустрэчу з работнікамі прадпрыемства «Кварц». Як яны ведалі кнігі Быкава! І як ён адказваў на іх пытанні! Гэта было непаўторна …А ў марскім музеі нам паказалі паўтараметровую рыбу-пілу, якую, кажа экскурсавод, называюць яшчэ «рыба-цешча». Дык Быкаў дастаў блакнот і запісаў.

«З нейкага часу мне стала душна і цесна ў Гродні — не ведаю чаму, але гэта так»,— зазначае Васіль Быкаў у «У доўгай дарозе дадому». Прачытаўшы кнігу, нешта, хаця і не ўсё, разумееш. Але, разам з тым, Васіль Уладзіміравіч называе горад «родным, благаслаўлёным». А з якой любоўю піша пра Нёман, дзе «на невялічкім маторным кацярку маркі «Прагрэс» аб'ездзіў усё наваколле ўверх і ўніз»!..

Барыс ПРАКОПЧЫК

Васіль БЫКАЎ і Юрка ГОЛУБ на сустрэчы з маракамі ў Калінінградзе (1987 г.).

■ Вакол футбола

НА КАНАПЕ ПЕРАД ВЯЛІЗНЫМ ЭКРАНАМ, ПАД ШУМ АКІЯНА…

ЯК ГЛЯДЗЕЦЬ ФУТБОЛ НЕБАНАЛЬНА

Са стартам футбольнага мундзіялю заўжды паўстае пытанне: дзе і ў якой кампаніі назіраць за гарачымі баталіямі на полі? Аддаць перавагу ціхаму сямейнаму вечару ля хатняга тэлевізара ці акунуцца ў вар'яцкую атмасферу спорт-бараў з іх нястрымнай весялосцю? І першым, і другім ужо нікога не здзівіць. Менавіта таму футбольныя актывісты і іншыя зацікаўленыя асобы ў розных кутках свету сёлета далі волю фантазіі і прапанавалі свае варыянты.

Пляжны футбол… ці футбол на пляжы?

У Бразіліі галоўным цэнтрам футбольнага свята стаў сусветна вядомы пляж Капакабана ў Рыа-дэ-Жанэйра. Напэўна, тыя, хто думаў, што Капакабана — гэта выключна берагавая лінія, прызначаная для пасіўнага летняга адпачынку, здзівяцца. Гэта шматпрофільны аб'ект, дзе не толькі праводзіцца самы папулярны карнавал, але і ладзяцца канцэрты «зорак» сусветнай сцэны і іншыя феерычныя шоу. Так, у 1994 годзе на канцэрт брытанскага спевака і лідара гурта The Faces Рода Сцюарда тут сабралася больш за 4 млн чалавек. У выніку падзея нават увайшла ў Кнігу рэкордаў Гінеса.

Цяпер легендарны пляж перажывае яшчэ адну праверку — наплыў футбольных фанатаў з усяго свету. Менавіта тут размясцілася галоўная фан-зона мундзіялю, якая атрымала назву Arena Copacabana. Вялікі экран, які відаць нават за межамі фан-зоны, піва і кайпірынья (папулярны бразільскі кактэйль.— **Аўт.**) амаль што задарма, забаўныя роставыя лялькі, якія не дазволяць засумаваць, і, безумоўна, Атлантычны акіян пад бокам. А яшчэ самая вясёлая інтэрнацыянальная кампанія, з якой, напрыклад, можна згуляць у футбол. Толькі пляжны.

Дарэчы, фан-зоны арганізаваны ва ўсіх гарадах, якія прымаюць чэмпіянат свету па футболе, за выключэннем Рэсіфе (гарадскому муніцыпалітэту банальна не хапіла грошай на ўладкаванне фан-зоны).

Пераўтварыць стадыён… у кіназалу

Аднак знайсці маштабныя фан-зоны падчас футбольнага першынства планеты можна не толькі ў Бразіліі. Так, самая вялікая фан-зона ў Берліне сапраўды ўражвае. У распараджэнні жыхароў і гасцей горада знаходзіцца тэрыторыя ў 80 тысяч квадратных метраў, якая працягнулася ад Брандэнбургскіх варот да Трыумфальнай калоны ў парку Тыргартэн. Цікава, што ў Германіі на гэты тэрмін нават унеслі папраўкі ў заканадаўства, каб футбольныя фанаты змаглі атрымаць асалоду ад калектыўнага прагляду любімай гульні. Справа ў тым, што пасля 22 гадзін у гэтай еўрапейскай краіне дзейнічае так званы закон аб абароне ад шуму, з-за якога, напрыклад, у начны час абмежавана нават праца аэрапортаў. Але падчас мундзіялю статус фан-зон будзе прыроўнены да статусу футбольных стадыёнаў, што ў адно імгненне вырашае праблему.

Але сапраўдным генератарам крэатыўных ідэй выступіў берлінскі футбольны клуб «Union». Хатні стадыён клуба на месяц ператварыўся ў сапраўдную кіназалу. На арэну завезлі 750 канап, якія размясцілі проста на полі перад вялізным тэлеэкранам.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

Вниманию держателей банковских платежных карточек ОАО «АСБ БЕЛАРУСБАНК»!

БЕЛАРУСБАНК

В связи с изменениями в законодательстве Республики Беларусь владельцам карт-счетов необходимо заключить дополнительные соглашения к действующим договорам карт-счета.

Для возможности оформления соглашений без посещения клиентами учреждений банка ОАО «АСБ Беларусбанк» размещает предложение на заключение дополнительного соглашения к договору карт-счета.

Дополнительное соглашение считается заключенным, если владельцем карт-счета в период с 20.06.2014 до 31.10.2014 включительно совершена любая приходная или расходная операция с использованием карточки или ее реквизитов (снятие наличных денежных средств, проведение оплаты товаров и (или) услуг, пополнение счета с использованием карточки). Клиентам, совершившим любую из указанных операций, в учреждение банка для заключения дополнительного соглашения обращаться не требуется.

Клиентам, которые не совершат операции в вышеуказанный период, для заключения дополнительного соглашения к договору карт-счета необходимо не позднее 28.11.2014 обратиться в учреждение банка, с которым заключен договор карт-счета.

Замена карточки в связи с заключением дополнительного соглашения к договору карт-счета не требуется.

Предложение на заключение дополнительного соглашения к договору карт-счета (публичная оферта)

Настоящий документ, размещенный в сети Интернет на веб-сайте по адресу: www.asb.by Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк», именуемым в дальнейшем БАНК, является публичной офертой, то есть предложением БАНКА заключить на условиях, указанных в настоящем предложении, дополнительное соглашение к договору карт-счета, определенному в соответствии с настоящим предложением.

БАНК считает себя на условиях, указанных в настоящем предложении, заключившим дополнительное соглашение к договору карт-счета, с физическим лицом, именуемым в дальнейшем КЛИЕНТ, которое при соблюдении условий настоящего предложения, в порядке и срок, предусмотренные настоящим предложением, отзовется на настоящее предложение (акцептует предложение).

Настоящее предложение связывает БАНК с «20» июня 2014 года и может быть акцептовано в срок до «31» октября 2014 года включительно.

Настоящее предложение может быть в любой момент отозвано БАНКОМ путем опубликования извещения об отзыве настоящего предложения.

Для акцепта настоящего предложения должно быть соблюдено следующее условие:

по состоянию на «20» июня 2014 года между БАНКОМ и КЛИЕНТОМ заключен договор карт-счета.

Дополнительное соглашение к договору карт-счета, заключенному между БАНКОМ и КЛИЕНТОМ, предусмотренное настоящим предложением, считается заключенным при акцепте КЛИЕНТОМ настоящего предложения.

Акцептом настоящего предложения признается ответ любого лица о его принятии, совершенный в срок и порядке, предусмотренные настоящим предложением. Акцепт должен быть полным, безоговорочным и не может быть совершен в ином порядке, чем предусмотренный в настоящем предложении.

Акцептом настоящего предложения (заключением дополнительного соглашения к договору карт-счета на изложенных далее условиях) является:

совершение КЛИЕНТОМ в период с «20» июня 2014 года до «31» октября 2014 года включительно приходной или расходной операции с использованием дебетовой банковской платежной карточки (или ее реквизитов), оформленной в рамках договора карт-счета, определенного в соответствии с настоящим предложением.

Предусмотренное настоящим предложением дополнительное соглашение к договору карт-счета, не содержащему условия овердрафтного кредитования, считается заключенным в момент акцепта КЛИЕНТОМ настоящего предложения.

Предусмотренное настоящим предложением дополнительное соглашение к договору карт-счета, содержащему условия овердрафтного кредитования, вступает в силу с момента акцепта настоящего предложения и применяется с 15 числа месяца, следующего за месяцем акцепта КЛИЕНТОМ настоящего предложения (если 15 число приходится на нерабочий день – с ближайшего следующего за ним рабочего дня).

Дополнительное соглашение к договору карт-счета, не содержащему условия овердрафтного кредитования

С момента акцепта настоящего предложения вступает в силу дополнительное соглашение на следующих условиях:

1. Наименование Договора карт-счета изложить в следующей редакции:

«Договор текущего (расчетного) банковского счета с использованием банковской платежной карточки».

2. По тексту договора слова «карт-счет» в соответствующих числе и падеже заменить словами «текущий (расчетный) банковский счет, доступ к которому может быть обеспечен при использовании дебетовой банковской платежной карточки» в соответствующих числе и падеже, слова «банковская пластиковая карточка» в соответствующих числе и падеже заменить словами «банковская платежная карточка» в соответствующих числе и падеже.

Дополнительное соглашение к договору карт-счета, содержащему условия овердрафтного кредитования

С момента акцепта настоящего предложения вступает в силу дополнительное соглашение на следующих условиях:

1. Наименование Договора карт-счета изложить в следующей редакции:

«Договор текущего (расчетного) банковского счета с использованием банковской платежной карточки».

2. По тексту договора слова «карт-счет» в соответствующих числе и падеже заменить словами «текущий (расчетный) банковский счет, доступ к которому может быть обеспечен при использовании дебетовой банковской платежной карточки» в соответствующих числе и падеже, слова «банковская пластиковая карточка» в соответствующих числе и падеже заменить словами «банковская платежная карточка» в соответствующих числе и падеже.

3. Проценты за овердрафт начисляются БАНКОМ со дня, следующего за днем возникновения задолженности по текущему (расчетному) банковскому счету, доступ к которому может быть обеспечен при использовании дебетовой банковской платежной карточки, по день ее погашения включительно.

4. Если КЛИЕНТ не погасил задолженность по овердрафту в установленный Договором срок, КЛИЕНТ уплачивает БАНКУ повышенные проценты в размере 1,5 годовой процентной ставки овердрафта, а также неустойку в размере 0,5 годовой процентной ставки овердрафта. Повышенные проценты и неустойка на сумму просроченной задолженности по овердрафту начисляются БАНКОМ со следующего дня после истечения срока погашения задолженности по овердрафту до ее полного погашения.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ЗАПРАШАЕ «СВАБОДНАЯ БІБЛІЯТЭКА»

Новы праект «Bookcrossing: свабодная медыятэка UPEGO» запусцілі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Працэс абмену заснаваны на прынцыпе: «Прачытаў — аддай іншаму». Праект «Bookcrossing» нарадзіўся ў 2001 годзе па ініцыятыве спецыяліста па інтэрнэт-тэхналогіях амерыканца Рона Хорнбэкера. Затым з ЗША рух перамясціўся ў Еўропу. Сёння па ўсім свеце ў сістэму распаўсюджвання кніг уцягнуты больш як 1 100 000 удзельнікаў.

Паліцы для ахвотных далучыцца да букросінгу размешчаны ў галоўным корпусе БДУ, на спецыяльным стэлажы з шыльдай «Букросінг». Скарыстацца кніжным фондам можа любы чалавек, і пры гэтым неабавязкова вяртаць кнігу на паліцу.

— Мы разлічваем, што паліцы нашага маленькага стэлажа будуць цалкам запоўнены кнігамі самых розных жанраў з асабістых бібліятэк нашых супрацоўнікаў і нашых студэнтаў, каб можна было задаволіць запыты ўсіх чытачоў,— прызналася спецыяліст упраўлення выхаваўчай работы БДУ Наталля Капацэвіч.

Акрамя таго, у бліжэйшы час з'явіцца і сшытак «Шукаю кнігу». Кожны зможа ўказаць у ім імя аўтара або назву твора, які хочацца прачытаць. І, магчыма, знойдзецца чулы чалавек, які задаволіць гэтае жаданне.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Год гасціннасці: падзейны турызм

СВЯТА ДЛЯ ГУРМАНАЎ

СЫРНЫ ФЭСТ СТАНОВІЦЦА ДОБРАЙ ТРАДЫЦЫЯЙ

Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, які знаходзіцца паблізу вёскі Азярцо, ператварыўся ў суботу ў гіганцкую святочную пляцоўку. У другі раз там адбыўся сырны фестываль.

Замест «бліноў» — сырныя галоўкі.

Разняволеная гульнявая атмасфера свята пачынала адчуваць яшчэ каля варот.

— Калі ласка, стойце. Сырны дазор! — гэтымі словамі валанцёры сустракалі на ўваходзе на тэрыторыю музея ўсіх гасцей.— Перад вамі стаіць невялічкі стэнд. Бачыце на ім кавалак зашмальцаванага сыру? Дык вось, яго паходжанне і ўласцівасці невядомыя. Аднак ёсць у яго прыкмета — вельмі агрэсіўныя паводзіны. Асаблівая прыкмета — непрыемны пах. Калі ўбачыце гэтага «нелегала» дзесьці на тэрыторыі — адразу паведамляйце нам, каб як мага хутчэй яго ўтылізаваць. І трымайце арыенціроўку на яго…

Крыху далей, каля імправізаванай сцэны, сабраліся дзясяткі гледачоў. Яны назіралі за тым, як прафесійныя кухары давалі майстар-класы па прыгатаванні смачных страў з сыру. А праз некалькі хвілін гледачы ператварыліся ў дэгустатараў: пакаштаваць прысмак, які лічаныя хвіліны таму сышоў з пліты, маглі ўсе ахвотныя.

А на плошчы пасярэдзіне музея разгарнуўся сапраўдны кірмаш. Тут сваю прадукцыю прапаноўвалі сыраробы з Магілёва, Паставаў, Пружанаў, Брэста, Кобрына, Рагачова… Усяго ж дзесяць прадпрыемстваў прадавалі сыры па дэмакратычных цэнах, ніжэйшых за магазінныя. Ад колькасці гатункаў сыру разбягаліся вочы: тут табе і казіны, і шакаладны, і «Пармезан», і «Стары Амстэрдам», і «Фермерскі», і «Беларускае золата», і «Манастырскі», і «Ланселот»… Што адметна, чэргі выстройваліся каля гандлёвых кропак не толькі па традыцыйныя віды сыроў, але і па тыя, якія былі прыгатаваны ў хатніх умовах па старадаўніх рэцэптах.

— У нас пятнаццаць сыраваараў аб'ядналіся ў клуб для сумеснай вытворчасці,— расказвае яго прадстаўнік Валяніцна Іванова.— Усе сыры, якія ў нас ёсць, маюць багатую гісторыю. У кожнай гаспадыні — свой унікальны рэцэпт, які дастаўся ад маці ці бабулі. І мы імкнёмся перадаць іх сваім дзецям.

Як зазначыў арганізатар фэстывалю, дырэктар Цэнтра стратэгічнага развіцця Анатоль Аканцінаў, беларуская сырная прамысловасць ужо дасягнула еўрапейскага ўзроўню. Аднак толькі гэтага недастаткова для паспяховага заваявання рынку — трэба шмат працаваць над рэкламай гэтага каштоўнага прадукту. Пра наш сыр павінны пачуць. І фэст — адзін са складнікаў будучага поспеху.

Аднак гонар за краіну на знешнім рынку пачынаецца з павагі на ўнутраным. І менавіта таму на сырным фэсце вытворцы знайшлі чым здзівіць нават пераборлівага пакупніка.

— Каб вылучыцца з агульнага натоўпу, трэба выстаўляць на продаж тое, чаго больш няма ні ў кога,— гаворыць тэхнолаг ААТ «Пружанскі малочны камбінат», які стаў генеральным партнёрам фэстывалю, Алена Карсюк.— І менавіта таму мы распрацавалі далікатэсны сыр з грыбамі шыітаке. На першы погляд ён мала чым адрозніваецца ад звычайнага, бо мае такі ж светла-жоўты колер. Аднак калі пакаштаваць, то вы адчуеце пікантны смак. Яго і ствараюць грыбы шыітаке.

Але карысныя яны не толькі гэтым. Медыцынскія даследаванні паказалі, што грыбы шыітаке зніжаюць узровень халестэрыну ў крыві, вельмі добра дапамагаюць хворым на дыябет — змяншаюць выпрацоўку цукру ды паляпшаюць выпрацоўку інсуліну.

Арганізатары свята падрыхтавалі шмат іншых конкурсаў для ўдзельнікаў. Гэта і дэгустацыя лепшага сыру, і «алімпійскія» гульні, і танец «Жывы сыр…» І вельмі добра, што свята на адкрытым паветры не ўдалося сапсаваць нават халоднаму даждлівому надвор'ю, у якім пасярэдзіне чэрвеня гучалі выразныя вераснёўскія ноткі…

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота аўтара

Шэф-повар Аляксандр ЧЫКІЛЕЎСКІ гатуе сырныя хрушчы.